ратуре необходимо формировать ценностное сознание, ценностные отношения ученика к миру, обществу, жизненным установкам и т.д., формировать систему ценностей и норм, регулирующих взаимодействие личности учащегося и общества в условиях современного этапа его развития.

**Литература**

1. Маслова, В.А. Лингвокультурология : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / В.А. Маслова. – М. : Академия, 2001. – 208 с.
2. Николаенко С.В. Теория и практика социокультурного развития учащихся 5–11 классов: национально-культурный содержательный аспект в контексте обучения русскому языку : монография / С.В. Николаенко. –Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2015. – 252 с.

**S.V. Nikolaenko**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: ns-lk@mail.ru

**Literature and Language in the Axiological Frame of the Lesson**

*Key words: axiological frame of the lesson, cultural values, axiological direction, legal and regulatory direction, literary direction, axiological reference points.*

*A student can study the world by means of literature and language, his theoretical and practical activity in the world. Thus, the axiological frame of the lesson is determined. The directions, the content and different kinds of activity within this frame are prevented in the article.*

**Т.М. Пучынская**
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: pvs71@mail.ru

УДК 371.314.6:821.161.3

## УНУТРЫПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ Ў ПРАЦЭСЕ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЕКТНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ

*Ключавыя словы: унутрыпрадметныя сувязі, мастацкая камунікацыя, праектная дзейнасць, старшакласнікі, літаратурная адукацыя.*

*У артыкуле разглядаюцца праблемы арганізацыі праектнай дзейнасці на ўроках літаратуры на аснове ўнутрыпрадметных сувязей. Паказваюцца патэнцыяльныя магчымасці і перспектывы працы старшакласнікаў у межах праектаў, падкрэсліваецца каштоўнасць унутрыпрадметных сувязей у арганізацыі ўзаемадзеяння вучэбнага матэрыялу пры вывучэнні літаратуры на павышаным і базавым узроўнях.*

Літаратурная адукацыя школьнікаў патрабуе рэалізацыі прынцыпу сістэматычнасці і сістэмнасці, калі «пры вывучэнні курса ўстанаўліваюцца знешнія і ўнутраныя сувязі паміж тэорыямі, законамі, фактамі, якія адлюстроўваюць у свядомасці вучня не толькі паняцці або нават законы, а тэорыі (Л. Я. Зорына) і цэласную навуковую карціну свету» [3, с.229]. Сістэмны падыход мае разнастайныя аспекты яго рэалізацыі, адзін з якіх — унутрыпрадметныя сувязі, аналіз твораў нацыянальнай літаратуры ў цесных генетычных, кантактных і тыпалагічных сувязях.

Найбольш актуальна выкарыстанне ўнутрыпрадметных сувязей у старшых класах, калі абагульняюцца веды вучняў, атрыманыя на папярэдніх этапах літаратурнай адукацыі. У старшых класах школьная праграма па беларускай літаратуры пабудавана ў адпаведнасці з гісторыка-храналагічным прынцыпам. Унутрыпрадметныя сувязі даюць магчымасць убачыць дынаміку літаратурнага працэсу, традыцыі і наватарства ў развіцці нацыянальнай літаратуры.

Педагагічна абгрунтаваным, на наш погляд, з'яўляецца выкарыстанне ўнутрыпрадметных сувязей у працэсе арганізацыі праектнай дзейнасці. Праца над праектам фарміруе шэраг даследчыцкіх уменняў старшакласнікаў: вылучаць праблему, структураваць матэрыял, падбіраць аргументы для пацвярджэння гіпотэзы. Праектная дзейнасць дапамагае таксама фарміраваць навыкі самастойнай працы, уменне працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі.Спецыфіка працы над праектам заключаецца ў накіраванасці на канкрэтны вынік, які можна атрымаць пры вырашэнні пэўнай праблемы.Этапы праектнай дзейнасці суадносяцца з навуковым даследаваннем. У працэсе адносна самастойнай пошукавай працы старшакласнікі засвойваюць новыя веды, развіваюць чытацкія ўменні і навыкі даследчыцкага характару.

Сучасная метадычная навука прапануе настаўніку літаратуры сістэмны падыход да выкарыстання ўнутрыпрадметных сувязей. С. А. Зінін адзначае, што літаратурнае ўзаемадзеянне адбываецца на трох узроўнях мастацкай камунікацыі: мастацкіх універсалій, міжтэкставага мастацкага



Репозиторий ВГУ

ўзаемадзеяння і гісторыка-біяграфічных сувязей [1]. Веданне настаўнікам асаблівасцей мастацкай камунікацыі дазваляе паслядоўна рэалізаваць унутрыпрадметныя сувязі на ўроках літаратуры.

Найбольш «кантактным» узроўнем мастацкай камунікацыі з'яўляюцца гісторыка-біяграфічныя сувязі. Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні аналізуюць асобаснае ўзаемадзеянне паміж пісьменнікамі (знаёмства, перапіска, сяброўства, сустрэчы, супрацоўніцтва ў межах літаратурнага аб'яднання і інш.), параўноўваюць факты біяграфіі. Гісторыка-біяграфічныя сувязі, аднак, не абмяжоўваюцца толькі асобаснымі кантактамі пісьменнікаў. Старшакласнікі павінны ўбачыць гісторыка-літаратурны кантэкст пэўнай эпохі, высветліць адносіны мастака слова да падзей часу, народа, гісторыі, звярнуць увагу на абставіны, што паўплывалі на фарміраванне светапогляду.

Асноўным прыёмам навучання ў працэсе выкарыстання ўнутрыпрадметных сувязей з'яўляецца параўнанне. Звяртаючыся да гісторыка-біяграфічных сувязей, школьнікі знаходзяць у лёсе пісьменнікаў не толькі аналогіі, падабенства, але і адрозненне, высвятляюць змест «дыялогу ў культуры», сутнасць палемікі, дыскусіі.

Праблемнае поле праектаў, заснаваных на гісторыка-біяграфічных сувязях, даволі разнастайнае. Вучням 11 класаможна, напрыклад, прапанаваць тэму«В. Быкаў і А. Адамовіч: блізкасць лёсаў».Творчасць В. Быкава вывучаецца манаграфічна,знаёмства з літаратурнай дзейнасцю А. Адамовіча арганізуецца ў межах аглядавай тэмы (беларуская літаратура на сучасным этапе). Прэзентацыя вынікаў праектнай дзейнасці адбываецца на аглядавых занятках.

У дадзеным праекце вучні выступаюць у ролі «біёграфаў»В. Быкава і А. Адамовіча, знаёмяцца з фактамі іх творчага і асабістага ўзаемадзеяння.Старшакласнікі праводзяць наступны параўнальны аналіз: В. Быкаў і А. Адамовіч як творчыя асобы, пакаленне, да якога належаць пісьменнікі, іх лёс, вопыт ваенных падзей, шматгадовае сяброўства.Старшакласнікі знаёмяццаз перапіскай В. Быкава і А. Адамовіча, у змесце якойзвяртаюць увагу на ацэнку В. Быкавым «Хатынскай аповесці», знаходзяць цікавыя выказванні А. Адамовіча адноснакаштоўнасціпамяці пра вайну. Дапаўняюць змест вучнёўскага праекта аўтабіяграфічныя дыялогі В. Быкава з А. Адамовічам, інтэрв'ю А. Адамовіча з В. Быкавым, сумесныя фотаздымкі пісьменнікаў.

Праектнаядзейнасць вучняў арганізуеццаў працэсезнаёмства як з аглядавымі, так і з манаграфічнымі тэмамі. У межах вывучэння творчасці пісьменніка старшакласнікімогуць распрацаваць праект«Творчы і сяброўскі асяродак В. Быкава». Удадзеным выпадкуакцэнт будзе зроблены на ўзаемадзеянні В. Быкава і, напрыклад, Р. Барадуліна — прадстаўнікоў розныхтыпаў творчай асобы.З вынікамі праектнай дзейнасці школьнікі выступаюць на ўступных або заключных занятках па творчасці пісьменніка.

Падрыхтоўка праекта патрабуе прадумвання канкрэтнага выніку, «прадукта» дзейнасці школьнікаў.Праекты, звязаныя з творчасцю В. Быкава, завяршаюцца, напрыклад, падрыхтоўкай дакладаў, прэзентацый. Карысным у плане літаратурнага развіцця школьнікаў стане стварэнне зборніка цытат і выказванняў В. Быкава і А. Адамовіча на тэму вайны, узятых з мастацкіх твораў, інтэрв'ю, перапіскі. Даклады, падрыхтаваныя вучнямі ў межах праектнай дзейнасці, могуць быць прадстаўлены не толькі на ўроку літаратуры. Калі вынікі працы маюць элементы навізны, яны могуць быць прэзентаваны на школьнай або гарадской навукова-практычнай канферэнцыі.

Эфектыўнымі ў плане літаратурнага развіцця старшакласнікаў з'яўляюцца праекты, заснаваныя на аналізе міжтэкставага мастацкага ўзаемадзеяння. Дадзены ўзровень мастацкай камунікацыі прадугледжвае дэталёвы параўнальны аналіз літаратурных твораў. Старшакласнікі высвятляюць уплыў адных мастацкіх з'яў на іншыя, традыцыі і наватарства ў развіцці літаратуры, «дыялог мінулага і сучаснага ў чалавечай памяці» [1].

На ўзроўні міжтэкставага мастацкага ўзаемадзеяння вучням 11 класа можна прапанаваць праект«Тэма калектывізацыі ў творчасці У. Бутрамеева і І. Мележа». Драма У. Бутрамеева «Страсці па Аўдзею» закранае праблему зямлі, чалавека і ўлады, традыцыйную для беларускай літаратуры. Прыкметнае ўзаемадзеянне ў тэматыцы твора і характары герояў назіраецца з раманам І. Мележа «Людзі на балоце».

У працэсе праектнай дзейнасці школьнікі параўноўваюць вобразы Аўдзея і Васіля Дзятла, знаходзяць у іх характарах агульныя рысы:жаданнебыць гаспадаром на зямлі, імкненне дасягнуць дабрабыту цаной уласнай працы, уменне адстаяць сваю пазіцыю. У вучняў фарміруецца ўменне даваць параўнальнуюхарактарыстыку герояў.На матэрыяле драмы У. Бутрамеева «Страсці па Аўдзею»і рамана І. Мележа «Людзі на балоце» старшакласнікі аналізуюцьпераемнасць ідэй, маральных калізій, тыпаў характараў героя ў літаратуры. Абодва аўтары асэнсоўваюць трагедыю селяніна-гаспадара ў час калектывізацыі. Важна, аднак, зарыентаваць школьнікаў не толькі на агульнасць тэматыкі і праблематыкі твораў, падабенства ў ідэйным змесце вобразаў герояў. Неабходна высветліць адметнасць аўтарскага пісьма, прааналізаваць тэксты на ўзроўні пераемнасці літаратурных эпох.Эфектыўнасць дадзенага праекта, які рэалізуецца ў межах аглядавай тэмы (бе-

Рэпазіторый ВДУ

ларуская літаратура на сучасным этапе), бачыцца ў забеспячэнні сувязі паміж вывучэннем літаратуры ў 10 і 11 класах.

Аналіз міжтэкставагамастацкагаўзаемадзеяннямэтазгоднаправодзіць і ў межах творчасці асобнага пісьменніка. Вучні 10 класа могуцьпараўнацьаповесці В. Быкава «Знак бяды» і«Жураўліны крык» — твор, вывучаныў сярэдніх класах. Абедзвеаповесці напісаны на тэму вайны. Школьнікі, аднак, павінны заўважыць дынаміку ў развіцці творчасці пісьменніка. «Жураўліны крык» у жанравых адносінах з'яўляецца «франтавой» аповесцю, «Знак бяды» — творам, у якім паказана вайна на акупаванай тэрыторыі.Старшакласнікі прыходзяць да высновы, што пісьменнік паглыбляе праблематыку твораў, у якіх паказаны чалавек на вайне, стварае новыя тыпы характараў герояў, імкнецца да шматпланавасці ў адлюстраванні ваенных падзей.

Параўнальны аналіз на ўзроўні міжтэкставага мастацкага ўзаемадзеяння мэтазгодна праводзіць у наступным напрамку: тэматыка, праблематыка твораў, асаблівасці жанру, кампазіцыі, характарыстыка літаратурнага героя. Кожны ўдзельнік праекта аналізуе адзін з пералічаных аспектаў міжтэкставага ўзаемадзеяння і прадстаўляе яго ў выглядзе даклада. Змест праекта можа быць дапоўнены матэрыяламі, што актуалізуюць асобасны вопыт школьнікаў, напрыклад, запісаміўспамінаў сваякоў (бабуль, дзядуль), знаёмых пра ваенныя падзеі на фронце або на акупаванай тэрыторыі. Школьнікамі могуць быць выкарыстаны дакументальныя сведчанні, запазычаныя з іншых крыніц інфармацыі (падручнікі па гісторыі, матэрыялы перыядычнага друку і інш.).Завяршаецца праект напісаннем сачынення«Чаму вучаць трагічныя старонкі гісторыі (паводле твораў В. Быкава)». Матэрыялы праекта пажадана аформіць у выглядзе альбома, які змяшчае раздзелы: «"Знак бяды" і "Жураўліны крык": параўнальны аналіз ваенных аповесцей В. Быкава», «Успаміны сведкаў вайны», «Сачыненні "Чаму вучаць трагічныя старонкі гісторыі (паводле твораў В. Быкава)"».

Значнымі для літаратурнага развіцця старшакласнікаў з'яўляюцца праекты, у якіх даследуюцца сувязі мастацка-ўніверсальнага характару. Мастацкіяўніверсаліі (архетып, міфалагема, «вечны» матыў, топас)«маюць важнае метадалагічнае значэнне і адкрываюць для чытача-школьніка вобласць шырокіх гісторыка-культурных абагульненняў» [1].

На заключнымэтапе літаратурнайадукацыі школьнікі могуцьраспрацаваць праект «Матыў "раскіданага" гнязда ў беларускай літаратуры». Праца ў межах дадзенага праекта дазволіць старшакласнікам убачыць мастацкія якасці ўніверсальнага характару ў праграмных творах.

Беларускія пісьменнікі традыцыйна імкнуцца асэнсаваць філасофскія і светапоглядныя праблемы, звязаныя з лёсам народа, яго складаным шляхам гістарычнага развіцця. Некаторыя «адвечныя» пытанні беларусаў выяўляюцца ў матыве«раскіданага» гнязда, страчанага бацькоўскага дому. Пачынаючы з аднайменнага твора Я. Купалы, гэты вобраз успрымаецца ў беларускай літаратуры як сімвал краху, няшчасця. Матыў «раскіданага» гнязда з'яўляецца скразным, у разнастайных варыяцыях ён паўтараецца не толькі ў класічнай, але і ў сучаснай літаратуры.

За аснову распрацоўкі дадзенай тэмы праекта,безумоўна, будзе ўзята драма Я. Купалы «Раскіданае гняздо». Вучні заканамерна прыходзяць да высновы, што разбурэнне хаты Зяблікаў успрымаецца як сімвал жыццёвай катастрофы герояў, за якой бачыцца драма Беларусі. Далейшае развіццё зместу праекта звязваецца з аповесцю В. Быкава «Знак бяды», у якой адчуваецца «працяг купалаўскага трагедыйнага матыву, таксама паказваецца крах традыцыйнага "гнязда"»[2, с.102]. В. Быкаў паказвае іншыя ў параўнанні з Я. Купалам гістарычныя абставіны, ідэйны змест твораў, аднак, мае падабенства. Сядзіба Багацькаў таксама, як і хата Зяблікаў, знішчана.Разбурэнне сялянскай хаты ў В. Быкава і Я. Купалыўспрымаецца як сімвал трагедыі ўсяго народа, руйнавання жыцця.

Страта бацькоўскага дома ў час нялёгкіх гістарычных выпрабаванняў асэнсоўваецца і сучаснымі пісьменнікамі. Вобраз хаты, якую неабходна адстаяць, прысутнічае ў драме У. Бутрамеева «Страсці па Аўдзею». Праяўляючы сапраўдную волю да жыцця, галоўны герой абараняе сваю сям'ю, гаспадарку, зямлю.

Рэалізацыя праекта па матывах «раскіданага» гнязда дапаможа школьнікам не толькі абагульніць вывучаны матэрыял, але і разгледзець літаратурныя з'явы ў шырокім культурна-гістарычным кантэксце,сфарміраваць уяўленне пра літаратуру як частку духоўнай культуры беларусаў.Дадзены праектахоплівае даволі аб'ёмны літаратурны матэрыял, прадугледжвае аналіз твораў у шырокім гістарычным кантэксце, таму ён рэалізуецца на заключным этапе навучання ў 11 класе.

Выкарыстанне ўнутрыпрадметных сувязей у працэсе праектнай дзейнасці, безумоўна, актывізуе працэс літаратурнага навучання старшакласнікаў. На практыцы, аднак, узнікаюць цяжкасці, звязаныя з падборам літаратурнага матэрыялу, тэарэтыка-літаратурных паняццяў, якія б адпавядалі школьнай праграме. Творчы падыход да выкладання літаратуры, веданне настаўнікам сучасных даследаванняў у галіне літаратуразнаўства, валоданне патрабаваннямі адукацыйнага стандарта дазваляюць рэалізаваць дадзены падыходпры вывучэнні літаратуры не толькі на павышаным, але і на базавым узроўнях.

Рэпазіторый БГУ

Такім чынам, даследаванне ўнутрыпрадметных сувязей у працэсе праектнай дзейнасці стымулюе даследчы, пошукавы характар навучання. Каштоўнасць унутрыпрадметных сувязей бачыцца ў арганізацыі ўзаемадзеяння вучэбнага матэрыялупры вывучэнні літаратуры на павышаным і базавым узроўнях. Праектная дзейнасцьпа літаратуры прывучае старшакласнікаў да працы, накіраванай на канкрэтнывынік, што актуальна для асобаснага развіцця школьнікаў.

**Літаратура**

1. Зинин, С.А.Внутрипредметные связи в изучении школьного историко-литературного курса / С.А. Зинин. – М. : Русское слово, 2004. – Режим доступа :refdb.ru>look/1990533/-pall.html. – Дата доступа : 19.08.2016.
2. Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя : манагр. / І.В. Жук [і інш.] ; пад агул. рэд. І.В. Жука. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 255 с.
3. Педагогика : учеб. пособие для бакалавров / под ред. П.И. Пидкасистого. – М. : Изд-во Юрайт, 2012. –235 с.

**T.M. Puchinskaya**
Baranovichi State University
e-mail: pvs71@mail.ru

**Inter-subject connections in the process of organization of the project activity at the lessons of literature**

*Keywords: inter-subject connections, artistic communication, project activity, seniors, literary education.*

*The article focuses on the problem of organization of project activities at the lessons of literature on the basis of inter-subject connections. It is shown the potential and prospects of work of seniors in project activity, it is also emphasized the value of inter-subject connections in the organization of interaction of educational material during the process of literature study at higher and basic levels.*

**Т.И. Синкевич**
Витебский государственный университет имени П.М. Машерова
e-mail: e-mail: sintat@inbox.ru

УДК 811.164.4’243:378.016

**ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ТЕКСТ КАК СРЕДСТВО РАЗВИТИЯ НАВЫКОВ РЕЧИ ПРИ ОБУЧЕНИИ РУССКОМУ ЯЗЫКУ КАК ИНОСТРАННОМУ**

*Ключевые слова: мотивация, умения, навыки, коллективное творчество, страноведение, художественный текст, речевая ситуация, коммуникация.*

*В статье рассматривается проблема обучения студентов- иностранцев русскому языку на примере чтения художественного текста. Автор статьи приводит примеры заданий и упражнений, которые способствуют развитию речевых умений и навыков.*

В русле коммуникативно-деятельностного подхода к обучению РКИ мы ориентируемся на личность иностранца, изучающего русский язык, как на равноправного речевого партнера. Изучение иностранного языка имеет как воспитательное, так и образовательное значение. Средством развития навыков речи служили и служат художественные тексты, имеющие не только воспитательно-образовательное значение, но нравственное, ибо с их помощью происходит проникновение в культуру народа, иностранец знакомится с традициями и бытом народа. Художественные тексты – средство, которое учит терпимости, воспитывает толерантность, уважение.

Цель статьи – показать, как с помощью художественного текста можно оптимизировать процесс обучения РКИ, ибо текст – это средство создания коммуникативных ситуаций.

Чтение художественного текста (на начальном этапе небольшого по объему) – это лучшее средство приобщения к культуре страны изучаемого языка. Кроме этого, в процессе чтения текста знания пополняются элементарными сведениями литературоведческого характера, студент-иностранец получает определенную информацию об авторе, о теме произведения, его жанре, языковых особенностях. Текст подвергается минимальной обработке, сложные синтаксические конструкции упрощаются. Использование приемов сугесто-семантической методики поможет студенту-иностранцу раскрепоститься, актуализировать коммуникативную компетенцию, и реализовать его творческий потенциал.

Предтекстовые задания способствуют более глубокому проникновению в текст, помогают развивать творческое мышления, актуализируют знания, умения и навыки.

Послетекстовые задания (ответы на вопросы) предполагают активное использование студентом-иностранцем грамматических конструкций и соответствующей лексики. Любое слово рассматривается не изолированно, а в образной системе произведения, в его реальном контексте, который дополнительно наполняется смыслом и значением. Языковой материал сопровождается иллюстра-



Репозиторий ВГУ